Источник: "Звязда" - 2014-06-07

# «КАБ НАРАДЖАЛІСЯ КНІГІ, ЯКІЯ БУДУЦЬ ПРЫНОСІЦЬ РАДАСЦЬ»

## Аб ролі пісьменніцкай суполкі сёння мы спыталі ў сучасных літаратараў

**Мікалай ЧАРГІНЕЦ, старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі:**

— 80-годдзе СПБ — гэта значны этап у развіцці беларускай літаратуры. За гэты час у айчынным пісьменстве з'явілася шмат найвыдатнейшых творцаў: Янка Купала, Якуб Колас, Іван Чыгрынаў, Андрэй Макаёнак, Максім Танк, Рыгор Барадулін, Васіль Быкаў ды многія іншыя. Цешыць, што і новы час нараджае таленавітых літаратараў. Згадаць хаця б Генадзя Пашкова, Міхася Пазнякова, Уладзіміра Гніламёдава, Анатоля Аўруціна, Алеся Бадака, Міколу Мятліцкага... Асабліва ж важна, што саюз падтрымлівае развіццё літаратуры ў рэгіёнах: у кожнай вобласці працуюць пісьменнікі пад старшынствам такіх адданых і руплівых дзеячаў, як Тамара Краснова-Гусачэнка, Анатоль Крэйдзіч, Уладзімір Гаўрыловіч, Людміла Кебіч, Уладзімір Дуктаў, Алесь Карлюкевіч. Сярод моладзі апошнім часам ярка заявілі пра сябе Маргарыта Латышкевіч, Рагнед Малахоўскі, Марыя Маліноўская, Дзмітрый Саўчык — здольныя не толькі прыгожа выкласці думкі на паперу, але і выказаць уласную думку, а потым несці за яе адказнасць. Яны — заўтрашні дзень нашай арганізацыі. Высокая ацэнка, дадзеная на адрас СПБ Прэзідэнтам нашай краіны, — вялікі гонар. Але гэта не азначае, што творцы павінны спачываць на лаўрах. Я заклікаю калег быць самакрытычнымі, адэкватна ацэньваць уласныя набыткі і не крыўдаваць на крытыку. Ад шчырага сэрца віншую ўсіх творцаў нашай краіны і нагадваю, што ўсе мы служым роднай Беларусі. Сваёй працай мы павінны імкнуцца найлепшым чынам прадстаўляць яе ва ўсім свеце. СПБ заключыў дагаворы аб супрацоўніцтве з 28 краінамі. Але галоўная наша мэта — стварэнне выдатнай літаратуры, якую з захапленнем будуць чытаць новыя пакаленні беларусаў!

**Уладзімір КАРЫЗНА, пісьменнік, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь:**

— Наша суполка — частка гісторыі. Пісьменнік заўжды быў той зоркай, на якую арыентаваліся, якой цікавіліся і за якой ішлі. Таму роля сучасных творцаў і літаратарскай суполкі ў тым, каб нараджаліся кнігі, якія будуць прыносіць радасць свайму чытачу, каб той, хто іх прачытаў, адчуў святло і цеплыню роднага слова і сваёй зямлі. Беларусь — краіна, моцная сваімі людзьмі. Менавіта пісьменнікі павінны дбаць пра тое, каб у народа быў настрой і для працы, і для адпачынку. Жыццё сёння няпростае, але, чытаючы вершы ў «ЛіМе», «Полымі», «Маладосці», «Нёмане», я радуюся, бо яны дораць мне адчуванне таго, чым жыве народ.

**Іван САВЕРЧАНКА, доктар філалагічных навук, прафесар:**

— Пісьменніцкая суполка выконвае вельмі важныя функцыі: найперш, яна з'яўляецца месцам абмену думкамі, тут творцы могуць аператыўна пазнаёміцца з навінкамі сучаснай літаратуры. Гэта ў пэўным сэнсе дыскусійны клуб, дзе часта адбываюцца спрэчкі пра стан літаратурнага жыцця. Надзвычай важна, што кіраўніцтва творчых суполак выконвае і значную арганізацыйную работу: ладзіць сустрэчы з чытачамі, рыхтуе літаратурныя вандроўкі, выконвае працу па вылучэнні пісьменнікаў на ўзнагароды.

**Анатоль КРЭЙДЗІЧ, старшыня Брэсцкага абласнога аддзялення СПБ:**

— За гады існавання саюза ў літаратуру прыйшло шмат цікавых таленавітых творцаў. СПБ разам са сваімі абласнымі аддзяленнямі імкнецца падтрымаць кожнага, дапамагчы выдаць і распаўсюдзіць кнігу. А ў выніку мы ўзнімаем на новую вышыню ўсю нашу літаратуру. Вельмі шмат зроблена, і гэта было б немагчымым без падтрымкі дзяржавы — не толькі Прэзідэнта, але і мясцовых улад. Увогуле, беларускія пісьменнікі — шчаслівыя людзі: нам ёсць пра што пісаць і ёсць каму чытаць. А літаратура заўжды дапамагае жыць, працаваць і думаць!

**Падрыхтавала Таццяна СІВЕЦ.**